# САМАЯ СВЯТАЯ ЯДА — ХЛЕБ

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **2.** Кусты ляшчыны; арэшнік. **6.** Не раскусіўшы арэх, ... не з'ясі. **7.** Адна з назваў Трэцяга Спаса (29 жніўня); яго называюць таксама Арэхавы, Хлебны, Ільняны, Палатняны Спас, Барадзень. **9.** Верхняя галінастая частка дрэва. **11.** Моцнае захапленне. **12.** Вадзяны арэх. **15.** У жніўні сонца грэе, а вада халадзее (прык.). **16.** Ансамбль з васьмі выканаўцаў. **19.** Пра што-небудзь прыгожае, цудоўнае. **21.** Ездзеш на часок — бяры хлеба ... (прык.). **24.** Гатунак марачнага белага віна. **25.** Тое, што і бульба (разм.). **27.** Невялікае насякомае-паразіт; некалі на Трэці Спас да ўсходу сонца праводзілі абрад выгнання ... з хаты, пры гэтым прыгаворвалі: «Прыйшоў Спас, каб не было ... у нас!». **28.** Дзе цвяток — там і ... (прык.). **29.** ... — прынясе хлеба чыстага (прык); ... або Успенне адзначалі 28 жніўня.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **1.** Пасудзіна для заквашвання цеста. **2.** «Тым часам спас святы мінуўся, // І ... у чырвань апрануўся». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Падгляд пчол»). **3.** Тое, што і дранка. **4.** Сукупнасць нормаў паводзін, мараль. **5.** Утрамбаваны калёсамі шлях, калiна. **8.** «Ах, ... ты мой!». З гэтымі словамі некалі падымалі з зямлі ўпушчаны хлеб, цалуючы яго. **10.** Адказ на загадку. **12.** ... не арэх — адразу не раскусіш (прык.). **13.** ... адлятаюць у тры Спасы, жоравы — да Трэцяга Спаса (прыкм.). **14.** Трэцяя нота музычнай гамы. **17.** Невялікі тонкі кавалачак хлеба. **18.** «Вунь Мікіта ідзе, // Мне ... нясе». З беларускай народнай песні «Пасылала мяне маць». **20.** Адзін ... ці сто коп — хлеба на год (прык.). **21.** Тое, што і магазін. **22.** Хлеб, спечаны з прасеянай скрозь сіта мукі. **23.** Доўгі кафтан. **26.** Самая святая яда — хлеб, самае святое ... — чалавек (казахская прык.).



**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 2. Ляшчэўнік. 6. Зерне. 7. Спажынкі. 9. Крона. 11. Азарт. 12. Чылім. 15. Сонца. 16. Актэт. 19. Краса. 21. Кусок. 24. Кокур. 25. Картоплі. 27. Клоп. 28. Мядок. 29. Прачыстая. **Па вертыкалі:** 1. Дзежка. 2. Лес. 3. Шчапа. 4. Этыка. 5. Накат. 8. Боханька. 10. Адгадка. 12. Чалавек. 13. Ластаўкі. 14. Мі. 17. Скібка. 18. Аршкі. 20. Сноп. 21. Крама. 22. Сітны. 23. Капот. 26. Імя.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.25 | 19.50 | 13.25 |
| Віцебск — | 6.12 | 19.42 | 13.30 |
| Магілёў — | 6.15 | 19.41 | 13.26 |
| Гомель — | 6.14 | 19.35 | 13.21 |
| Гродна — | 6.40 | 20.05 | 13.25 |
| Брэст — | 6.43 | 20.03 | 13.20 |

### Месяц

*Поўня 6 верасня.*
*Месяц у сузор'і Рыбаў.*

### Імяніны

***Пр.** Калініка, Мікалая, Паўла, Яфрэма.*
***К.** Дароты, Ваўжынца, Лаўрэна, Станіслава, Тодара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**5 ВЕРАСНЯ**

**1817** год — нарадзіўся Аляксей Канстанцінавіч Талстой (1817—1875), рускі пісьменнік. У 1837—1840 гадах займаў высокія дыпламатычныя і прыдворныя пасады. З 1854 года — у часопісе «Современник», дзе разам са сваімі стрыечнымі братамі Жамчужнікавымі друкаваў сатырыка-парадыйныя творы за подпісам Казьма Пруткоў. Аўтар драматычнай трылогіі «Смерць Івана Грознага», «Цар Фёдар Іванавіч» (пастаноўкай гэтай трагедыі ў 1898 г. быў адкрыты Маскоўскі Мастацкі тэатр), «Цар Барыс». Рамансы на яго словы пісалі М. А. Рымскі-Корсакаў, П. І. Чайкоўскі, М. П. Мусаргскі і інш. У 1946 годзе п'есу «Цар Фёдар Іванавіч» паставіў Дзяржаўны рускі драматычны тэатр Беларусі. На беларускую мову асобныя вершы Талстога пераклаў Хведар Жычка.

**1905** год — Расія і Японія падпісалі ў Портсмуце (ЗША) мірны дагавор, які скончыў руска-японскую вайну 1904—1905 гадоў. Японія, лічачы сябе пераможцам у вайне, патрабавала перадачы ёй права на арэнду Ляодунскага паўвострава, Паўднёва-Маньчжурскай чыгункі, увесь Сахалін, прызнання за ёю «свабоды дзеянняў» у Карэі, выплаты кантрыбуцыі, адводу рускіх войскаў з Маньчжурыі, абмежавання ваенна-марскіх сіл Расіі на далёкім Усходзе з выдачай Японіі інтэрнаваных у нейтральных портах рускіх караблёў, атрымання права рыбнай лоўлі ўздоўж рускага ўзбярэжжа. Аднак Расія адразу ж адхіліла многія патрабаванні, нягледзячы на ціск амерыканскага боку. Перагаворы апынуліся на мяжы зрыву, тады, наліханая перспектывай працягу вайны, Японія адмовілася ад шэрагу патрабаванняў і, пасля напружанай дыпламатычнай барацьбы, 5 верасня 1905 года Портсмуцкі мірны дагавор быў падпісаны.



**1923** год — нарадзіўся Іон Сідаравіч Солтыс, Герой Савецкага Саюза (1945). Асабліва вызначыўся пры вызваленні Польшчы. 11 лютага 1945 года пад моцным агнём праціўніка адным з першых фарсіраваў раку Бобер. Прыкрываючы пераправу сваёй часці, падавіў агонь 3-х кулямётных кропак ворага. Калі кулямётны агонь праціўніка прымусіў байцоў чарговы час залегчы, Солтыс, нягледзячы на раненне, кінуўся да амбразуры варожага дота і закрыў яе сваім целам. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

**1932** год — нарадзіўся Барыс Рыгоравіч Лысікаў, беларускі вучоны ў галіне вылічальнай тэхнікі і інфарматыкі, доктар тэхнічных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па вылічальнай тэхніцы, лагічным праектаванні звышвялікіх інтэгральных схем і мікрапрацэсараў, інфармацыйных тэхналогіях.

**1972** год — падчас ХХ летніх Алімпійскіх гульняў, якія праходзілі ў Мюнхене (Германія) 26 жніўня — 11 верасня, члены арганізацыі «Чорны верасень» здзейснілі тэрарыстычны акт супраць каманды Ізраіля. Загінулі 11 прадстаўнікоў ізраільскай дэлегацыі і нямецкі паліцэйскі. На Алімпіядзе ў знак жалобы на адзін дзень былі прыпынены ўсе спаборніцтвы.

**Было сказана**

**Віктар Эміль ФРАНКЛ, аўстрыйскі псіхолаг:**
*«Толькі ў той меры, у якой чалавеку ўдаецца ажыццявіць сэнс, які ён знаходзіць у знешнім свеце, ён ажыццяўляе і сябе».*

## ПАБОЧНЫЯ ДЗЕЯННІ САМАГОНУ

**За адно парушэнне — пяць пратаколаў**

**Работнікамі Мядзельскай міжраённай інспекцыі сумесна з супрацоўнікам Вілейскага РАУС у лясным фондзе Вілейскага доследнага лясгаса затрыманы 47-гадовы жыхар Мінска, ураджэнец тутэйшых мясцоў, які займаўся вытворчасцю самагону ў лесе.**

Незаконнай высечкай дрэў, забруджваннем лесу адходамі самагонаварэння, знішчэннем ляснога падсцілку і жывога надглебавага покрыва навакольнаму асяроддзю нанесена шкода ў памеры, які перавышае 400 рублёў. За дадзеныя парушэнні ў дачыненні да грамадзяніна складзена тры пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях. У выніку шматлікіх «здыманняў проб» свайго гатовага прадукту самагоншчык быў моцна п'яны. Пры затрыманні неаднаразова абразіў службовую асобу Дзяржаўнай інспекцыі, за што быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

Канфіскавана 35 літраў самагонкі. Парушальнік, хутчэй за ўсё, у пяты раз па адным факце будзе прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УСМІХНЕМСЯ

**Я вельмі рознабаковая асоба. Я дрэнна спяваю, няўмела танцую, непрыгожа малюю, пішу маркотную музыку і жудасныя вершы, умею нясмачна гатаваць.**

— Мяне ўчора абакралі.
— Што ўзялі?
— Адно барахло. Якраз тое, што мне зусім не трэба.
— Дык чаго ты знерваваўся?
— Мне яшчэ столькі ўсяго трэба выкінуць, а яны не ўзялі.

— У Японіі наогул мода на грудзі маленькага памеру.
— Гэта не мода, гэта неўраджай!

**Папрасіла мужа зварыць грэчку.**
**Пытанне «Яна павінна праколвацца, як бульба, ці ўсплываць, як пельмені?» збянтэжыла мяне надоўга.**

**Убачыўшы Машу на пляжы, матэматык Сярожа зразумеў, што тое, што ён яшчэ ўчора лічыў выпуклымі паверхнямі, гэта практычна былі плоскасці.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар САХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3438.
Нумар падпісаны ў 19.30 4 верасня 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12